Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гомель: суд пакараў журналістку-фрылансера Ларысу Шчыракову штрафам у памеры 25 базавых велічынь

05.04.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова



Ларыса Шчыракова.

5 красавіка суддзя Тамара Застаўнецкая (суд Гомельскага раёна) вынесла рашэнне аб пакаранні штрафам у памеры 25 базавых велічынь журналіста-фрылансера Ларысу Шчыракову. Яе абвінавацілі ў парушэнні артыкула 22.9 КаАП (незаконны выраб прадукцыі СМІ, праца без акрэдытацыі на замежнае СМІ). Ларыса Шчыракова падрыхтавала відэасюжэт «Барысаўская трагедыя можа паўтарыцца ў Гомелі» і размясціла яго на сваёй старонцы ў Youtube і на рэгіянальным сайце навін «Сильные новости». У сюжэце ішла гаворка пра праблемы жыхароў пасёлка Бальшавік Гомельскага раёна – яны скардзіліся на моцны пах газу, але ў дзяржаўных установах іх не чулі. Да тых часоў, пакуль не ўбачылі сюжэт у інтэрнэце. У Бальшавік прыехалі газавая служба, супрацоўнікі МНС, ліквідавалі праблему.

Міліцыя ж вырашыла, што сюжэт – уласнасць тэлеканалу «Белсат», прычым на якой падставе супрацоўнікі УУС прыйшлі да такой высновы – яны тлумачыць не сталі. У судзе 5 красавіка Ларыса Шчыракова падала хадайніцтва аб выкліку на паседжанне супрацоўнікаў УУС, якія складалі рапарт і напісалі, што сюжэт – уласнасць «Белсат», каб яны патлумачылі такія высновы. Але суддзя адхіліла хадайніцтва. Тады журналістка заявіла аб недаверу да суддзі. Але і гэта не было прынята пад увагу – справу і надалей разглядала тая ж Тамара Застаўнецкая.

Яна, выслухаўшы фрылансера, і нават не сыходзячы ў дарадчы пакой, тут жа на месцы вынесла рашэнне – прызнаць вінаватай, пакараць штрафам.

У 2016 годзе ў дачыненні Ларысы Шчыраковай былі складзены пяць пратаколаў па артыкуле 22.9 КаАП. Два пратаколы былі разгледжаны ў судах (Савецкага раёна Гомеля і Светлагорскага), і адміністрацыйныя справы па іх былі спынены. Суд жа Гомельскага раёна ўжо другі раз з пачатку году

пакараў Ларысу Шчыракову штрафам. Яшчэ яе чакае суд у Лельчыцкім раёне – за здымкі ў вёсцы Новае Палессе сюжэту пра народны абрад.

«Такое адчуванне, што судовыя рашэнні прымаюцца не на падставе закону, а нейкіх тэндэнцый, загадаў зверху, з іншых інстанцый, і залежаць ад таго, у каго краіна просіць грошы – у МВФ ці Расіі, ці вядзе перамовы з еўрапейскімі структурамі, пацяпленне зараз ці пахаладанне. Не думаю, што абскарджванне дасць плён, але гэта варта рабіць, каб паказаць сістэматычны пераслед фрылансераў, перашкоды ў працы журналістаў у Беларусі, адсутнасць свабоды слова», - пракаментавала фрылансер.

Твитнуть







праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY